

# ВІКТАР ШНІП



Віктар Анатольевіч Шніп - беларускі пісьменнік, перакладчык. Член Саюза пісьменнікаў СССР (1984). Лаўрэат прэміі імя Уладзіміра Маякоўскага Савета Міністраў Грузінскай ССР (1987). Лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Мастацкая літаратура» (2008).







# БІЯГРАФІЯ

Віктар Анатольевіч Шніп нарадзіўся 26 сакавіка 1960 года ў в. Пугачы Валожынскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1978 годзе скончыў Мінскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум. Працаваў цесляром на будоўлях Мінска, літаратурным кансультантам у часопісе «Нёман» і ў газеце «Вячэрні Мінск». У 1987 годзе скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Працаваў рэдактарам аддзела культуры ў часопісе «Беларусь» (з 1987 года), газетах "Наша слова" (адказны сакратар) і «Літаратура і мастацтва» (намеснік галоўнага рэдактара, галоўны рэдактар у 2002-2003). У 2003-2008 гадах - намеснік галоўнага рэдактара, з 2008 года - галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура».

## ТВОРЧАСЦЬ

Дэбютаваў у 1977 годзе (газета «Чырвоная змена»). З'яўляецца аўтарам больш за 10 паэтычных кніг, шэраг вершаваных тэкстаў пакладзены на музыку беларускімі рок-гуртамі. Піша прозу, перакладае на беларускую мову.

## ЎЗНАГАРОДЫ І ЗВАННІ



- Лаўрэат імя Уладзіміра Маякоўскага Савета Міністраў Грузінскай ССР (1987) за кнігу «Гронка Святла» (1987).
- Лаўрэат літаратурнай прэміі «Залаты купідон" (2006)
- Лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Мастацкая літаратура» (2008).



# БІБЛІЯГРАФІЯ




## •Зборнікі паэзіі

- «Гронка святла» (1983)
- «Пошук радасці» (1987)
- «Шляхам ветру» (1977)
- «Горад Утопія» (1990)
- «На рэштках Храма» (1995)
- «Чырвоны ліхтар» (2000)
- «Інквізіцыя» (2002)
- «Выратаванне атрутай» (2003)
- «Беларускае мора» (2004)
- «Першы папяровы снег » (2014)
- «Чырвоны ліхтар-2» (2016)

## •Зборнікі паэзіі і прозы

- «Балада камянёў : паэзія і проза» (2006)
- «Страла кахання, любові крыж : кніга паэзіі і прозы (2008)
- «Проза і паэзія агню : вершы, аповесць, эсэ» (2010)
- «Тутэйшая туга» (2014)

## •Дзённікавая проза

- «Пугачоўскі цырульнік : дзённікавая проза паэта» (2013)
- «Заўтра была адліга» (2015)

## •Літаратурныя творы для дзяцей

- «Наш Максім гаворыць: — Гу! : Вершы» (1999)

# ТВОРЫ

## Снег

Адцвітае снежань
З неба асыпаецца снег
Ён белы як неба
Як крылы анёлаў
Снег гэта попел ад кастрышча
На якім згарэла восень
Снегу радуюцца
Бо ён хавае бруд
Снегу баяцца
Бо на ім бруд высвечваецца
Снег смяецца і плача
Снег замерзлае святло
Якое ляцела да зорак
І ўпаўшы назад на зямлю
Асвяціла ў нас спадзяванні
Што не ўсё так змрочна
Снег жыве столькі
Колькі яму дазволіць сонца
І адны снег любяць
Другія снег праклінаюць
А ён ляціць і ляціць на зямлю
Каб тут памерці і нарадзіцца
І дзеці лепячы Снегавіка
Вераць што ён ажыве
Так як верыў Бог
Ствараючы гэты белы свет
Ствараючы гэты белы снег

## Дым

Дым імкнецца ў неба
Як вязень на волю
І знікае не разумеючы волі
Дым узветраныя валасы ведзьмы
Якая жыве ў агні
Можа схавацца ў дыме
І можа згубіцца ў дыме
І паўзе дым па зямлі як цмок
Якому адсеклі галаву
У якога душа - дагараючае вогнішча
І ніхто не любіць дыму
Дым самагубца
І ў яго жыццё кароткае
Як летняя купальская ноч
Дзе дзяўчаты і хлопцы
Скачуць праз вогнішча
Узлятаючы як дым
І гляджу я на дым
Як на густую павуціну
У якой трапечуцца зоркі
Як залатыя камары.

## Здрада

Яна пільнуе
Калі не на кожным кроку
То амаль на кожным скрыжаванні
Цемры і святла святла і цемры
Здрада радуецца
Як воўк які апусціў у палонку хвост
І ловіць рыбу
Здрада выспявае ў здрадніку
Як атрута ў змяі
Здрадай ратуюцца хіжыя
Як смерцю ратуюцца вольныя
Здрада як зумкая муха
Прысутнічае на тайнай вячэры
Здрада гэта трэшчына ў сасудзе
У якім збіраюцца захоўваць жывую ваду
Здрада гэта ўсмешка д'ябла
І задаволены здраднік
Атрымаўшы сваё
Ходзіць сярод нас
І вітаецца з намі
І сядзіць за адным сталом
Гаворачы нам
Што мы таксама не святыя
Здрада гэта дым над Айчынай
У якім сонца
Як пацалунак Іуды

# СПАСЫЛКІ


- https://be.wikipedia.org/wiki/Віктар_Анатолевіч_Шніп
- http://knihi.com/Viktar_Snip/
- https://www.sb.by/articles/pamyat-raskryvaetsya-kak-parashyut.html
- https://news.tut.by/culture/534281.html?